Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

# ЛЮТНЕВАЯ МУЗЫКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПЕРАЛАЖЭННІ ДЛЯ КЛАСІЧНАЙ ГІТАРЫ

*Рэпертуарны зборнік*

Складальнік П. І. Бортнік

Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў
для студэнтаў напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-2
Народная творчасць (інструментальная музыка),
спецыялізацыі 18 01 01-02 01 Інструментальная музыка народная

Мінск
БДУКМ
2022

УДК [780.614:780.613.13](081.2)"15/17"
ББК 85.314
Л963

Р э ц э н з е н т ы:
*У. І. Захараў,* дацэнт кафедры музычнага мастацтва
ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы», дацэнт;
*М. І. Сеўрукоў,* прафесар кафедры баяна і акардэона
ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», прафесар

Л963 **Лютневая музыка** Вялікага Княства Літоўскага ў перала-жэнні для класічнай гітары : рэпертуарны зборнік / склад. П. І. Бортнік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2022. – 35 с.
ISBN 978-985-522-314-7.

Цікавасць да музыкі мінулых стагоддзяў абумоўлена істотнымі зменамі, якія адбыліся ў выканальніцкай практыцы гітарыстаў. Расце колькасць канцэртаў, фестываляў і конкурсаў, прысвечаных музычнаму мастацтву эпохі Адраджэння. Лютневая музыка з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця гітарнага выканальніцкага мастацтва. Яе ўключаюць у вучэбны, канцэртны і конкурсны рэпертуар. Мэта зборніка – пашырэнне рэпертуару гітарыстаў.

Адрасуецца навучэнцам музычных каледжаў, студэнтам устаноў вышэйшай адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў, прафесійным гітарыстам і гітарыстам-аматарам.

**УДК [780.614:780.613.13](081.2)"15/17"**
**ББК 85.314**

**ISBN 978-985-522-314-7**

© Бортнік П. І., укладанне, 2022
© Афармленне. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2022

# ПРАДМОВА

Гітарная школа ў Беларусі сёння займае пачэснае месца ў шэрагу іншых еўрапейскіх выканальніцкіх школ, нягледзячы на тое, што яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя яна знаходзілася на стадыі развіцця. Менш чым за паўстагоддзя атрымалася наладзіць трывалую сістэму адукацыі, выхаваць сусветна вядомых выканаўцаў і стварыць арыгінальны нацыянальны рэпертуар. Тым не менш, недастаткова ўвагі даследчыкаў і выканаўцаў накіравана ў гістарычнае мінулае, дзе ў лютневым рэпертуары, без сумневу, можна знайсці карані сучаснага гітарнага выканальніцкага майстэрства.

Традыцыйна гітара і лютня разглядаюцца як вельмі блізкія інструменты, а лютневыя пералажэнні ў гітарным рэпертуары з'яўляюцца звычайнай практыкай у Еўропе і на сённяшні дзень. Паколькі лютневая музыка складае важную частку гітарнага рэпертуару, для беларускіх гітарыстаў вельмі важна імкнуцца да выканання рэпертуару, які мае непасрэднае дачыненне да фонаасяроддзя Беларусі XVI–XVII стст. Лютневаму выканальніцтву яшчэ толькі належыць прайсці той доўгі шлях з небыцця, які пераадолела гітара ў Беларусі, а пералажэнне лютневай музыкі кампазітараў XVI–XVII ст. для гітары з'яўляецца першаснай неабходнасцю, якая дазволіць «ажывіць» гэты пласт музыкі. Вядома, што большасць лютністаў таго часу мелі замежнае паходжанне, але яны стваралі свае творы і выконвалі іх у тым ліку і ў Беларусі.

Згодна з даследаваннямі В. Жывалеўскага і В. Дадзіёмавай, у XVI ст. па запрашэнні каралевы Боны Сфорца на тэрыторыі сучаснай Беларусі ігралі шматлікія лютністы з замежжа, пераважна з Італіі. Сярод іх неабходна згадаць і Мікеланджэла Галілея, роднага брата знакамітага астранома Галілео Галілея. Менавіта яго творы ў французскай табулатуры змешчаны ў зборніках Мюнхена і ў лютневай кнізе Георга Леапольда Фурмана (1615).

Найбольшую цікавасць сярод лютністаў уяўляе выканаўца венгерскага паходжання Валянцін Бакфарк (1507, Кранштат – 1576, Падуя), ці Валянцін Грэф, чые творы адрозніваліся надзвычайнай вытанчанасцю. Як сведчыць нямецкі даследчык Ёзаф Цут, фенаменальнасць Бакфарка была яшчэ і ў тым, што ён парадаксальным чынам «сумяшчаў жыццё віртуоза і палітычнага авантурыста». Нягледзячы на паходжанне, яго можна аднесці да прадстаўнікоў

італьянскага стылю, ці італьянскай школы, бо ён вучыўся ў Антоніа Ротты з Падуі.

Дыямед Като (Катоне) з Венецыі быў яшчэ адным італьянскім лютністам, які працаваў на тэрыторыі Беларусі на пачатку XVII ст. Яго творы ўвайшлі ў табулатурныя зборнікі такіх вядомых лютністаў, як Іаган Рудэ (1600), Жан Батыст Безар (1603), Ёахім ван дэр Ховэ (1612), Георг Леапольд Фурман (1615), а два яго зборнікі песень пад лютню выйшлі ў Кракаве (1606 і 1607).

Войцэх Длугарай – яшчэ адзін вядомы музыка, які ў перыяд XVI–XVII стст. іграў у Гродзенскай капэле (1583–1585). Акрамя кампазітарскай і выканальніцкай дзейнасці, ён прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці. Ёзаф Цут згадвае рукапісны зборнік Длугарая ў Лейпцыгскай бібліятэцы (прыблізна 1619).

Згаданыя імёны фарміравалі толькі частку разнастайнай лютневай культуры XVI–XVII стст., якая была значным элементам тагачаснага фонаасяроддзя. Дзякуючы такім зборнікам і пералажэнням, як гэты, старадаўняя музыка Беларусі стане больш даступнай для сучаснага слухача, што дазволіць лепш зразумець і адчуць культурны кантэкст XVI–XVII стст.

Дар’ян Шахаб

# УВОДЗІНЫ

Матэрыял рэпертуарнага зборніка «Лютневая музыка ВКЛ у пералажэнні для класічнай гітары» распрацаваны для студэнтаў-гітарыстаў спецыяльнасці «народная творчасць (інструментальная музыка народная)» па вучэбнай дысцыпліне «Спецінструмент (струнныя народныя)». Засваенне дадзенай вучэбнай дысцыпліны прадугледжвае паслядоўнае засваенне методыка-тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў ігры на гітары, а яе мэтай з'яўляецца развіццё і ўдасканаленне выканальніцкага і музычна-педагагічнага майстэрства ў галіне інструментальнага выканальніцтва. У цяперашні час рэпертуар, які вывучаюць студэнты на занятках спецыялізацыі, надзвычай шырокі і ўключае ў сябе творы розных эпох – ад эпохі Рэнесансу да сучасных п'ес у эстрадна-джазавай стылістыцы, што прадугледжана тэматычным планам вучэбнай дысцыпліны.

Цяперашні час адзначаецца істотнымі зменамі, якія адбыліся ў выканальніцкай практыцы гітарыстаў. Так, музыканты ўсё часцей звяртаюцца да лютневай музыкі, уключаючы яе ў вучэбны, канцэртны і конкурсны рэпертуар. Акрамя таго, лютневая музыка з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця гітарнага выканальніцкага мастацтва на сучасным этапе. Патрэба вывучэння лютневага рэпертуару, а таксама адсутнасць зборнікаў па лютневай музыцы эпохі Рэнесансу на тэрыторыі сучаснай Беларусі падкрэслівае неабходнасць і своечасовасць стварэння рэпертуарнага зборніка «Лютневая музыка ВКЛ у пералажэнні для класічнай гітары», асноўная мэта якога – пашырэнне гітарнага рэпертуару.

Хацелася б адзначыць, што для спасціжэння лютневай музыкі ў пералажэнні для гітары патрабуецца веданне тэарэтычных тэзісаў аб прынцыпах яе выканання. Дадзеная работа арыентавана на студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, навучэнцаў музычных каледжаў, прафесійных гітарыстаў і музыкантаў-аматараў. Матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў адукацыйным працэсе пры стварэнні рэсурснага забеспячэння заняткаў па дысцыплінах «Спецінструмент (гітара)», «Камерны ансамбль», «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару».

У рэпертуарным зборніку «Лютневая музыка ВКЛ у пералажэнні для класічнай гітары» сабраныя лепшыя прыклады кампазіцый з рэпертуару замежных лютністаў эпохі Рэнесансу, якія жылі на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага: Валянціна Бакфарка,

Мікеланджэла Галілея, Войцэха Длугарая, Дыямеда Като. Таксама ў зборнік уваходзіць адна кампазіцыя ананімнага аўтара, якая называецца «Bathori Tanzt», што сведчыць аб прыналежнасці твора да музычнай культуры Вялікага Княства Літоўскага.

На першы погляд, з-за падабенства строя рэнесанснай лютні з гітарным выкананнем лютневых расшыфровак на гітары не ўяўляе складанасці, аднак паміж гітарай і лютняй ёсць шэраг адрозненняў. Напрыклад, мензура лютні менш, таму некаторыя акорды выконваць лягчэй. Збольшага гэтую праблему можна вырашыць кападастрам на трэцім ладзе, што аўтар і прапануе зрабіць. Здвоеныя струны ствараюць дадатковы аб'ём, што дазваляе больш складна выконваць шчыльную фактуру, у якой вельмі часта лютністы выкладаюць музычны матэрыял. Часам на гітары трэба шукаць новыя аплікатурныя рашэнні, каб дамагчыся таго ж эфекту.

Лютневыя творы часта маюць складаную поліфанічную структуру, аднак табулатурны запіс аднагалосны, таму аўтар пры расшыфроўцы вырашыў абмежавацца двухгалосным запісам, лёгка чытальным, але, як і арыгінал, не адлюстроўваючым належным чынам галасавядзенне. Тут ад выканаўцы патрабуецца пэўная доля творчасці.

Усе басовыя ноты, якія давялося перанесці на актаву вышэй, бо яны не могуць быць выкананыя на шасціструннай гітары, маюць спецыяльныя абазначэнні. Такім чынам гітарысты-мультыструннікі могуць выконваць творы з арыгінальнымі басамі.

**ЗМЕСТ**


**Прадмова** ........................................................................... 3
**Уводзіны** ........................................................................... 5

**Валянцін Бакфарк**
1. Чорная Карова ........................................................................... 7
2. Гальярда ........................................................................... 9
3. Прыгожы нямецкі танец ........................................................................... 10
4. Ніколі не кажы ........................................................................... 11
5. Фантазія ........................................................................... 12

**Дыямед Като**
1. Прэлюдыя ........................................................................... 15
2. Польскі танец 1 ........................................................................... 16
3. Польскі танец 2 ........................................................................... 17
4. Гальярда ........................................................................... 17
5. Фаварыт ........................................................................... 18

**Войцэх Длугарай**
1. Прэлюдыя ........................................................................... 20
2. Кавалі ........................................................................... 22
3. Віланэль ........................................................................... 24
4. З вялікім болем ........................................................................... 25
5. Цяпер я закаханы ........................................................................... 26

**Мікеланджэла Галілей**
1. Таката ........................................................................... 27
2. Вольта ........................................................................... 28
3. Куранта ........................................................................... 29
4. Балет ........................................................................... 31

**Ананім**
Танец Баторый ........................................................................... 32

# Чорная карова

## Czarna krowa

Валянцін Бакфарк
Balint Bakfark
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III





# Гальярда

## Gagliarda

Валянцін Бакфарк
Balint Bakfark
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III



# Прыгожы нямецкі танец

## Shöner deutscher dantz

Валянцін Бакфарк
Balint Bakfark
(arr. Pavel Bortnik)



# Ніколі не кажы
## Non dite mai

Валянцін Бакфарк
Balint Bakfark
(arr. Pavel Bortnik)

③=f♯ capoIII





# Фантазія
## Fantasy

Валянцін Бакфарк
Balint Bakfark
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III






II
III
II
II
II
III
II
II



# Прэлюдыя
## Preludium

Дыямед Като
Diomedes Cato
(arr. Pavel Bortnik)

③=f♯ capo III



# Польскі танец
## Chorea polonica

Дыямед Като
Diomedes Cato
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III



# Польскі танец
## Chorea polonica

Дыямед Като
Diomedes Cato
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III



# Гальярда
## Galliarde

Дыямед Като
Diomedes Cato
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III






# Фаварыт
## Favorito

Дыямед Като
Diomedes Cato
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III

⑥ = D







# Прэлюдыя

## Preludium

Войцэх Длугарай
Wojciech Dlugoraj
(arr. Pavel Bortnik)

③=f♯ capo III




I
III
III
I
(8va)
(8va)
(8va)
(8va)

# Кавалі
## Kowaly

Войцэх Длугарай
Wojciech Dlugoraj
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III




(8va)

# Віланэль
## Vilanella

Войцэх Длугарай
Wojciech Dlugoraj
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III



# З вялікім болем
## Mitt vielen schmertzen

Войцэх Длугарай
Wojciech Dlugoraj
(arr. Pavel Bortnik)



# Цяпер я закаханы

## Nun bin Ich durch liebe

Войцэх Длугарай
Wojciech Dlugoraj
(arr. Pavel Bortnik)

③=f♯ capo III
⑥ = D



# Такатa
## Toccata

Мікеланджэла Галілей
Michelangelo Galilei
(arr. Pavel Bortnik)

③ =f♯ capo III





# Вольта
## Volta

Мікеланджэла Галілей
Michelangelo Galilei
(arr. Pavel Bortnik)





# Куранта
## Corrente

Мікеланджэла Галілей
Michelangelo Galilei
(arr. Pavel Bortnik)

③= f♯ capo III

⑥=D







# Балет
## Ballet

Мікеланджэла Галілей
Michelangelo Galilei
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III





# Танец Баторый
## Bathori tantz

Ананім
Anonymous
Wurstisen lute book 1591
(arr. Pavel Bortnik)

③ = f♯ capo III




(8va)
(8va)
V
III
(8va
(8va

*Вучэбнае выданне*

# ЛЮТНЕВАЯ МУЗЫКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПЕРАЛАЖЭННІ ДЛЯ КЛАСІЧНАЙ ГІТАРЫ

*Рэпертуарны зборнік*


Складальнік **Бортнік** Павел Ігаравіч

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік
Дызайн вокладкі М. М. Чудук

Падпісана ў друк 10.10.2022. Фармат 60x84 $^{1}/_{8}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 4,12. Ул.-выд. арк. 4,25. Тыраж 50 экз. Заказ 768.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.